Репозиторий ВГУ

**Прымшыц А.Ю.**
ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска”
(РБ, Віцебск)

## АБАГУЛЬНЕННЕ ВОПЫТУ РАБОТЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ВУЧНЯЎ ДА ЎДЗЕЛУ Ў АЛІМПІЯДЗЕ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

Для сучаснай педагогікі вельмі актуальнай з’яўляецца праца з адоранымі вучнямі, таму што на іх робіцца стаўка як на заўтрашніх навукоўцаў, што будуць развіваць высокія тэхналогіі, у краіне створана база дадзеных пад назваю “Адораныя вучні”, існуе Прэзідэнцкі фонд падтрымкі перспектыўнай моладзі. Гэтых людзей рыхтуе школа, таму менавіта тут ствараюцца ўсе ўмовы для паспяховай працы з такімі вучнямі. Відавочна, што ў сучаснай школе павінна быць створана такое асяроддзе, якое дасць магчымасць дзецям паспяхова развіваць свае здольнасці ў розных прадметных галінах і стане адначасова навучальным, развіваючым і выхаваўчым. У дадзенай рабоце разгледжана сістэма

працы з адоранымі вучнямі па падрыхтоўцы да ўдзелу ў алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры, бо аўтар работы мае пэўны вопыт у гэтай галіне. Таму мэтай работы з'яўляецца апісанне і прэзентацыя вопыту працы з адоранымі вучнямі па падрыхтоўцы да ўдзелу ў алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры.

Задачамі дадзенай работы з'яўляюцца:

- апісаць ролю прадметнага кабінета як умовы стварэння інфармацыйнага асяроддзя з высокай ступенню матываванасці да набыцця ведаў;
- раскрыць і апісаць змест працы на ўроках па беларускай мове з адоранымі вучнямі;
- апісаць змест працы ў час правядзення факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры з адоранымі вучнямі;
- даць прыклады заданняў, якія садзейнічалі б падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры;
- апісаць вопыт індывідуальнай работы з вучнямі па падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Любы прадметны кабінет у школе стварае інфармацыйнае, развіццёвае і выхаваўчае асяроддзе, павышае матывацыю дзейнасці, таму такім важным этапам у працы настаўнікаў з'яўляецца стварэнне сучасных прадметных кабінетаў у школе.

Кабінет гімназіі №1 раскрывае канцэпцыю кнігі, таму што яна дазваляе паказаць сучасную інтэлектуальную Беларусь з яе творчым патэнцыялам, якая ведае сваё гістарычнае мінулае, ганарыцца сённяшнім і глядзіць у будучыню. Кабінет беларускай мовы і літаратуры афармлены такім чынам, што спрыяе развіццю цікавасці вучняў, дазваляе падаць матэрыял звыш гімназічнай праграмы, адлюстроўвае некаторыя алімпіядныя заданні. Кожная літара, кожнае слова знаходзяцца ў ім на сваім месцы і выконваюць не толькі эстэтычную функцыю, але і служаць пэўным стэндам для вывучэння і замацавання правіл сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Так, напрыклад, столь афармлена літарамі са шрыфтоў Ф.Скарыны, са Статута ВКЛ 1588 года, таму што кнігадрукаванне на Беларусі пачалося менавіта з Ф.Скарыны, а Статуты ВКЛ – галоўныя дакументы той эпохі. На жалюзі змешчана інфармацыя пра развіццё публіцыстыкі і кнігадрукавання ў XIX - п. XX ст., выявы факсімільных выданняў гэтага часу, выдавецкія суполкі п. XX ст., якія друкавалі кнігі на беларускай мове. У кабінеце знаходзіцца галерэя народных пісьменнікаў (ад Я. Купалы да І.Навуменкі). У анатацыі да партрэтаў змешчаны сціслы матэрыял пра іх, самае цікавае, што сустракаецца ў алімпіядных заданнях па беларускай літаратуры. Напрыклад, у адным з заданняў алімпіяды трэба было назваць тых аўтараў, што ўваходзілі ў "калектыў мсціслаўцаў". Гэта былі А.Куляшоў, Ю.Таўбін, З.Астапенка, бо вучыліся ў Мсціслаўскім педтэхнікуме. Гэта інфармацыя і была пакладзена ў аснову анатацыі да партрэта А.Куляшова.

Стэнд кабінета ўключыў рад гістарычнай пераемнасці ад мінулага да сучаснасці, ён прысвечаны пісьменнікам і гістарычным дзеячам Віцебшчыны, а таксама мае рубрыкі "Сёння на ўроку", "Гэта цікава", "Рыхтуемся да …", раздзелы па новых правілах беларускай мовы, творчай дзейнасці, па падрыхтоўцы да алімпіяды. Да апошняй рубрыкі быў падабраны эпіграф з "Апокрыфа" М. Багдановіча: "Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком". Гэтыя словы ўзятыя за дэвіз для вучняў-алімпіяднікаў, бо яны адлюстроўваюць сутнасць мастацтва, значэнне творчасці ў жыцці, сімвалізуюць унутраны патэнцыял вучня, які развіваецца кожным настаўнікам. Афармленне і

Рэпазіторый ВГУ

напаўненне кабінета спрыяе фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі вучняў, якія працуюць у такім прадметным асяроддзі, якое выконвае адначасова навучальную, развіццёвую і выхаваўчую функцыі.

Поспех у інтэлектуальным развіцці школьніка дасягаецца галоўным чынам на ўроку, калі настаўнік застаецца сам - насам са сваімі выхаванцамі. І ад яго ўмення арганізоўваць сістэматычную пазнавальную дзейнасць залежыць ступень цікавасці навучэнцаў да вучобы, узровень ведаў, гатоўнасць да пастаяннай самаадукацыіі, г. зн. іх інтэлектуальнае развіццё. Задача настаўніка – навучыць вучняў весці назіранні, творча думаць, разважаць, самім рабіць вывады і абагульненні.

Любы настаўнік, які рыхтуе вучняў да алімпіяды, здачы ЦТ, ведае, што поспех немагчымы без усведамлення вучнем мовы як сістэмы. Кожны раздзел мовы не існуе ізалявана, ён звязаны з іншымі раздзеламі, таму і вывучаецца ў школьным курсе адначасова марфалогія і арфаграфія, сінтаксіс і пунктуацыя. Вучню неабходна валодаць сістэмай правіл, добра ведаць тэорыю, замацаваць яе на практыцы, навучыцца працаваць на выпраўленне і аналіз сваіх памылак. Таму аўтар дадзенай працы прапануе сваю сістэму работы з моўным матэрыялам, так званыя вучэбна-карэкцыйныя комплексы, бо яны дазваляюць трывала засвоіць моўныя правілы, замацаваць іх на практыцы, скарэкціраваць свае памылкі і папярэдзіць іх у наступным.

У сучаснай школе вялікая роля ў падрыхтоўцы дзяцей да ўдзелу ў алімпіядах адводзіцца факультатыўным заняткам, таму што колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне беларускай мовы, а тым больш літаратуры, не дазваляе якасна падрыхтаваць вучня да ўдзелу ў алімпіядзе на ўроку. Дадаткова займацца толькі мовай недастаткова, таму што на сённяшні дзень многія заданні алімпіяды тычацца літаратуры, на ёй грунтуецца водгук, вуснае выказванне. Аўтар працы аналізуе комплексы, якія дапамагаюць навучыць дзяцей не толькі складаць вусныя выказванні, пісаць водгукі, але і вучыць самаацэнцы і самааналізу работы, таму іх карысна выкарыстоўваць у працы па падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Кожнае дзіця, якое прыходзіць у школу, мае здольнасці ў пэўнай галіне. Не бывае неталенавітых дзяцей, і місія настаўніка-раскрыць гэты талент, стварыць глебу для яго развіцця. Работу па падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры трэба пачынаць як мага раней. У гімназіі выпрацавана сістэма падрыхтоўкі вучняў да алімпіяды пачынаючы з 5 класа. Кожную чвэрць навучэнцам 5-8 класаў раздаюцца заданні круглагадовай унутрыгімназічнай алімпіяды. Вучні выконваюць іх у асобных сшытках і ў канцы чвэрці здаюць на праверку настаўніку. У канцы навучальнага года падводзяцца вынікі і лепшыя вучні ўзнагароджваюцца дыпломамі.

Для вучняў 9-11 класаў распрацавана аналагічная сістэма, толькі для старэйшых вучняў заданні супадаюць з этапамі Рэспубліканскай алімпіяды: гімназічнай, раённай, абласной, рэспубліканскай. На дадатковых занятках кожнае заданне разбіраецца, тлумачыцца ў індывідуальным парадку.

На думку аўтара працы, развіццё творчых здольнасцяў і інтэлектуальных уменняў школьнікаў, выяўленне іх адоранасці немагчыма без індывідуалізацыі навучання. Таму на працягу 9 год настаўніца вывучала літаратуру па дадзенай тэме, займалася падрыхтоўкай вучняў да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, распрацавала сістэму работы з адоранымі вучнямі па падрыхтоўцы да ўсіх этапаў алімпіяды: лінгвістычнага конкурсу, напісання водгуку, вуснага выказвання. За 9 год яе вучні атрымалі на трэцім (абласным) этапе алімпіяды па

Рэпазіторый ВГУ

беларускай мове і літаратуры 6 дыпломаў трэцяй ступені, 2 дыпломы другой ступені і 3 дыпломы першай ступені, на заключным чацвёртым (рэспубліканскім) этапе алімпіяды па беларускай мове і літаратуры 2 дыпломы трэцяй ступені і 1 дыплом першай ступені. Акрамя таго, аўтар чатыры апошнія гады з'яўляецца членам журы абласной алімпіяды і працуе на зборах па падрыхтоўцы дзяцей да заключнага чацвёртага (рэспубліканскага) этапу алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Дадзеная сістэма працы з адоранымі вучнямі мае плённыя вынікі, таму трэба прызнаць яе карысць у справе падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры.

**Спіс літаратуры**


1. Алімпіяды па беларускай мове / У.І. Кулікові́ч.-Мінск: Аверсэв, 2007.
2. Урокі падрыхтоўкі да алімпіяды / У.І. Куліковіч.- Мінск: Беларус. асац. "Конкурс", 2009.
3. Гин, А.А. Приёмы педагогической техники / А.А.Гин. – Гомель: ИПП «Сож», 1999. – 88 с.
4. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии / Н.И.Запрудский. – 2-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2004. – 287 с.
5. Колеченко, А.К. Энциклопедия педагогических технологий / А.К.Колеченко. – Санкт – Петербург: Каро, 2005. – 367 с.
6. Ксензова, Г.Ю. Перспективные школьные технологии / Г.Ю.Ксензова. – Москва: Педагогическое общество России, 2000. – 223 с.


Репозиторий ВГУ